старую Беларусь і шлях «обшчэ расійскі і польскі», самым апошнім называе свой родны шлях. Пра такі ж свой адметны беларускі шлях развіцця кажа таксама І. Канчэўскі. Беларусы не захацелі падпарадкавацца Заходняму шляху ці ісці за Усходам, яны зразумелі, што ў іх павінен быць свой шлях развіцця, што ім трэба шукаць нейкія новыя ідэалы, захоўваючы незалежнасць свайго духу і духоўнасць.

М. Гарэцкі з вялікай нецярплівасцю чакае добрага беларускага крытыка. Але яшчэ болей яму хочацца, каб беларуская літаратура выйшла на сусветны узровень, а нашых пісьменнікаў ведалі і паважалі ва ўсім свеце. Творчасць, развіццё літаратуры, на думку М. Гарэцкага, для культурнага і духоўнага адраджэння іграе таксама немалаважную ролю.

Вельмі падрабязна спыняецца на разглядзе праблемы творчасці І. Канчэўскі. На яго думку, менавіта культурнае адраджэнне, духоўная асвета, творчасць паспрыяюць развіццю краіны. У якасці высокага прыкладу, да якога мы павінны дарастаць, І. Канчэўскі прыводзіць Францыска Скарыну. Гэта першы чалавек, які ўсвядоміў, што мы прыйдзем да ўсечалавечага ідэалу толькі праз развіццё духоўнасці, асабістага і народнага духу.

Такім чынам, і М. Гарэцкі, і І. Канчэўскі гавораць пра неабходнасць нацыянальнай, чалавечай годнасці. Заўсёды ў любых абставінах чалавек павінен заставацца чалавекам. Абодва пісьменнікі закранаюць праблему нацыянальнага адраджэння. І. Канчэўскі прапануе творчасць, якая з'яўляецца, на яго думку, глебай для культурнага адраджэння. М. Гарэцкі таксама лічыць, што праз развіццё культуры — мовы, літаратуры, гісторыі, тэатра — мы прыйдзем да нацыянальнага адраджэння. Асаблівую надзею пісьменнік ускладвае на літаратуру, якая павінна даць сапраўдных дзеячаў. Яны змаглі б не толькі вывесці літаратуру на міжнародны ўзровень, але і выхоўваць новыя пакаленні беларусаў.

М. Гарэцкі лічыць, што ў беларусаў павінен быць свой самабытны шлях, непадобны да іншых народаў: шлях сумненняў і выбару, шлях да станаўлення нацыянальнай свядомасці.

## ПРА НЕКАТОРЫЯ КРЫТЭРЫІ АДБОРУ ЗМЕСТУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ»

***Лявонава П. І.***, *Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Адбіраць змест па названай вучэбнай дысцыпліне заўсёды нялёгка. Цяжкасці абумоўлены, па-першае, тым, што за папярэднія гады навучання студэнты набылі даволі грунтоўныя веды па гісторыі сусветнай і беларускай літаратуры, назапасілі досвед па тэорыі і гісторыі культуры. Да таго ж цягам восеньска-зімняга семестра ўжо на 5-м курсе ім чытаецца курс па тэорыі літаратуры, які заканчваецца экзаменам. Атрымліваецца, што навучэнцы маюць дастаткова добрую падрыхтоўку, каб пісьменна аналізаваць мастацкія тэксты. Аднак наш шматгадовы вопыт працы з пяцікурснікамі сведчыць, што гэта не зусім так. На самай справе яны знаёмыя з пэўнымі творамі або ўсёй творчасцю знакамітых аўтараў заходнееўрапейскіх літаратур, ведаюць гісторыю амерыканскай і беларускай літаратуры, навучылі-

ся вытлумачваць змест мастацкіх твораў з ідэалагічных і маральных пазіцый у адпаведнасці з той інтэрпрэтацыяй, якая давалася выкладчыкам або змешчана ў падручніках. Але на знаходжанне ўласнай чытацкай інтэрпрэтацыі, на выяўленне асобасных сэнсаў, здабытых у працэсе суперажывання з літаратурнымі героямі і сатворчасці з аўтарам, студэнтам як бы заўсёды не хапае часу. А між тым вядома, што сваю культурную функцыю літаратурны твор выконвае толькі ў тым выпадку, калі разглядаецца з пазіцыі ўнутранай арганізацыі тэксту, калі асэнсоўваецца чытачом, а тым больш будучым спецыялістам-культуролагам, у сваёй эстэтычнай і камунікатыўнай функцыях, што і з'яўляецца галоўнай мэтай навучання ў курсе «Аналіз мастацкага тэксту». Тут на занятках яны вучацца асэнсоўваць мастацкі тэкст як эстэтычны аб'ект, г. зн. бачыць у ім не толькі сродак пастаноўкі аўтарам надзённых праблем або данясення важных ідэй, але і своеасаблівы лабірынт «счапленняў» думак, перажыванняў, вобразаў, сатканых з жывога маўлення ва ўсім багацці яго вобразна-выяўленчых сродкаў, якія выступаюць матэрыяльным носьбітам эстэтычнага сэнсу.

Таму першы крытэрый, якога мы прытрымліваліся ў працэсе адбору зместу ўсяго курса, — гэта скіраванасць на вырашэнне адукацыйных задач.

Другі крытэрый — захаванне пераемнасці з вучэбнымі дысцыплінамі, якія ўжо былі або яшчэ будуць засвоены студэнтамі, і найперш, у змесце курсаў «Тэорыя літаратуры», «Гісторыя беларускай літаратуры», «Гісторыя сусветнай літаратуры», «Тэорыя культуры».

Пераемнасць у аспекце зместу азначае выкарыстанне на кожным новым этапе навучання ведаў і ўменняў, набытых на папярэднім, г. зн. актуалізацыя апорных ведаў і пабудова падмурку для выканання аналагічных дзеянняў у будучым. У аспекце працэсуальнасці пераемнасць азначае ўзаемасувязь форм, метадаў і сродкаў навучання, прымяненне тэхналогій, якія б забяспечвалі студэнтам магчымасць развіваць свае творчыя здольнасці.

Яшчэ адным з вядучых крытэрыяў адбору зместу па курсу «Аналіз мастацкага тэксту» з'яўляецца ўлік неабходнасці дыялогу паміж беларускай і рускай літаратурамі і культурамі, які мае даўнюю гісторыю, плённа развіваецца і сёння.

У метадычным плане такі крытэрый азначае, па-першае, адбор для кожных практычных заняткаў пэўных «згусткаў» тэарэтычнага матэрыялу па ключавых пытаннях, такіх, напрыклад, як праблема прынцыпаў і прыёмаў аналізу, стыль, мастацкасць, умовы захавання эстэтычнага падыходу да аналізу і інтэрпрэтацыі ды іншых, усіх тых, што атрымалі найбольш глыбокае вырашэнне ў працах расійскіх вучоных (М. М. Бахціна, У. І. Цюпы, В. М. Жырмунскага, А. Б. Есіна і інш.); па-другое, папераменнае выкарыстанне на занятках найлепшых у мастацкіх адносінах і разам з тым невялікіх па памерах твораў рускіх і беларускіх аўтараў; нарэшце, па-трэцяе, вядзенне дыялогу або вучэбных дыскусій на рускай ці беларускай мовах у адпаведнасці з мовай арыгіналу тэксту, які разглядаўся на занятках.

У такім выпадку студэнты атрымліваюць магчымасць не толькі выпрацоўваць уменні па аналізе ды інтэрпрэтацыі мастацкіх тэкстаў, але яшчэ і ўдасканальваць свае маўленчыя навыкі, і ў тым ліку навык аператыўна пераключацца з адной блізкароднаснай мовы на другую, што таксама вельмі важна для спецыяліста-культуролага.

Апроч таго, вялікае адукацыйнае значэнне для студэнтаў набывае сама практычная дзейнасць па аналізе мастацкіх тэкстаў у працэсе вучэбных заняткаў. Гэтая дзейнасць уяўляе сабой акт камунікацыі (зносін з пісьменнікам і культурай пэўнай эпохі, з аднакурснікамі і выкладчыкам). З другога боку, яна мае трывалы падмурак, неабходны пры творчым успрыманні мастацтва, — даследчыцкую скіраванасць. Яе змест рэалізуецца пры ўмове сумеснай дзейнасці выкладчыка і студэнтаў на практычных занятках, а таксама пры ўмове захавання іх сатворчасці і дыялогу.

Крытэрыем, які вынікае з гэтага, з'яўляецца стварэнне выкладчыкам аптымальных умоў для творчасці студэнтаў, што азначае сістэматычнае спалучэнне разгляду мастацкіх тэкстаў, якія адабраў ён сам, з тымі, што выбралі студэнты, чаргаванне вусных і пісьмовых, індывідуальных і групавых форм аналізу, заўсёдная наяўнасць і адкрытасць для ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу таго тэарэтычнага матэрыялу, на які яны могуць абаперціся (або спаслацца) у працэсе аналізу.

## МЕТОДИКА ПРЕПОДАВАНИЯ КУЛЬТУРОЛОГИИ В ВУЗЕ И РЕШЕНИЕ ЗАДАЧ ДУХОВНОГО СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ ЛИЧНОСТИ

***Максимова Н. А.**, Белорусский государственный университет*

Преподавание культурологии как науки о культуре возможно в различных смысловых аспектах: 1) наука, научная картина мира в системе культуры; 2) политическая организация общества как структура, определяющая характер культуры; 3) специфика производства, характер труда, производственных отношений, определяющих специфику культуры; 4) культура как тип коммуникаций и способов передачи информации. Но наиболее плодотворной с точки зрения решения задач духовного совершенствования личности является традиция, основанная на изучении культуры в единстве и взаимодействии таких ее составляющих, как искусство, религия, мораль.

Процесс преподавания культурологии, с одной стороны, опирается на достижения общей педагогики и психологии, с другой — строится на принципах философской методологии, связан с философско-методологическими традициями осмысления духовно-практической деятельности людей. Преподавание культурологии неизбежно предполагает выбор общефилософских методологических принципов, определяющих постановку вопросов, решение проблем и парадоксов, условий познания. На наш взгляд, наиболее эффективными методологическими основаниями изучения и преподавания культурологии в вузах могут служить аксиологический и герменевтический подходы в изучении закономерностей формирования, развития, функционирования различных культур.

Изучение культурологии на пути постоянного обращения к вопросам развития и функционирования художественной культуры открывает перспективы для формирования достойного нравственного облика студентов. Мир искусства — важный фактор накопления духовных, душевных качеств